# "ЗОРНЫЯ" ПАХОДЫ Ў НАВАКОЛЛЯХ ВІЦЕБСКА ЯК СРОДАК АКТЫВІЗАЦЫІ ВЫХАВАЎЧА-ПАТРЫЯТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ З НАВУЧЭНЦАМІ ГОРАДА

*Півавар Мікалай Васільевіч*

***Аннотация.*** *Адной з найбольш дзейнасных форм патрыятычнага выхавання моладзі з'яўляецца правядзенне турыстычных паходаў, экскурсій, паездак. У савецкія часы былі распаўсюджаны "зорныя" паходы на месцы, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны — месцы здзяйснення подзвігаў, масавага знішчэння мірнага насельніцтва, спаленых вёсак, воінскія пахаванні і іншыя. У артыкуле прапаноўваюцца маршруты да такіх месцаў памяці ў наваколлях Віцебска. Асобна падаюцца маршруты аўтобусных паездак да самых знакавых месцаў Віцебскай вобласці.*

У савецкія часы існавала такая форма працы ў навучальных установах, як "зорныя" паходы. Звычайна яны рабіліся на месцы, звязаныя з падзеямі Вялікай Айчыннай вайны. Турыстычная група рабіла паход да некалькіх такіх месцаў, прыбірала помнік, пахаванне ці памятнае месца, сустракалася з ветэранамі, вучнямі мясцовай школы, дзе разам ўзгадвалі пра падзеі вайны, потым, як правіла, рабілі і спартыўныя спаборніцтвы. У выніку такіх мерапрыемстваў праводзілася важная грамадска-карысная справа — добраўпарадкаванне і дагляд за пахаваннямі і помнікамі, мацавалася сувязь пакаленняў, адбывалася суперажыванне і далучэнне да жывой гісторыі, а не фармальны ўдзел у мерапрыемствах.

Шмат што змянілася з савецкіх часоў, нешта, як, напрыклад, сустрэчы з ветэранамі ці відавочцамі вайны, мы зрабіць ужо не зможам. Але ў "зорных" паходах закладзены вялікі патэнцыял патрыятычнай працы, які мы можам і павінны выкарыстоўваць і ў нашы дні. І добраўпарадкаванне, і сам працэс пахода, і суперажыванне на месцах баёў застаюцца моцнымі інструментамі захавання памяці пра вайну, выхавання грамадзянскіх якасцяў, ў першую чаргу, патрыятызма. На пачатку XXI стагоддзя наша памяць павінна стаць перашкодай тым, хто жадае перагледзець вынікі вайны, выхаласціць гісторыю нашага народа, забыць тое, што дастойна павагі, і, наадварот, узвысіць неістотнае і недастойнае.

У Віцебскім кадэцкім вучылішчы распрацаваны некалькі дзесяткаў маршрутаў "зорных" паходаў у наваколлях Віцебска. Яны складзены па методыцы арганізацыі пахода нядзельнага адпачынку. Гэта значыць без начоўкі, толькі на працягу светлавога дня так, каб за адзін раз паходная група магла наведаць некалькі важных у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны аб'ектаў (помнікаў, пахаванняў, памятных месцаў, музеяў, арганізацый і інш.). Для паходаў не трэба спецыяльны турыстычны рыштунак, хаця пры жаданні і магчымасцях паходы ў цёплы час года можна рабіць і з начоўкай, мяняючы маршрут па жаданні. Паходы не патрабуюць і значных матэрыяльных выдаткаў: толькі сродкі на праезд у грамадскім транспарце ці на прыгарадным чыгуначным транспарце. Выгады такіх паходаў відавочныя: і выхаваўчыя, і матэрыяльныя. Для настаўнікаў падрыхтоўка перад паходам не вельмі вялікая. Пра месцы вандровак ёсць дастаткова матэрыялаў, у тым ліку і ў інтэрнэце. У будучым мы плануем да распрацаваных маршрутаў зрабіць невялікі пуцяводнік.

Для больш зацікаўленых прапануем паездкі па найбольш цікавых і знакавых месцах у бліжэйшыя да Віцебска раёны: Аршанскі, Бешанковіцкі, Дубровенскі, Лёзненскі, Полацкі, Ушацкі і іншыя. Сур'ёзнымі выдаткамі будзе толькі арэнда аўтобуса, але на вялікую групу сума на аднаго ўдзельніка не выглядае занадта вялікай. Тым болей, што група зможа наведаць найбольш важныя для кожнага віцябляніна месцы — Ціхмянаўскую вышыню на Лёзненшчыне, мемарыяльны комплекс "Прарыў" на Ушаччыне, месца першага залпа "Кацюш" у Аршанскім раёне, "Поле ратнай славы" на Полаччыне, магілу 8 Герояў Савецкага Саюза ў в. Узрэчча і іншыя.

Пасля выбара маршрута варта добра да яго падрыхтавацца. Прапануем выкарыстаць некаторыя пісьмовыя і лічбавыя крыніцы, у якіх можна адшукаць больш інфармацыі пра тыя аб'екты, якія вы будзеце наведваць. Самым карысным, на нашу думку, будзе "Звод помнікаў воінскай славы, памятных месцаў, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр Вялікай Айчыннай вайны Віцебскага раёна" [9]. Шмат інфармацыі пра помнікі і абставіны баёў змяшчаецца ў томе, які прысвечаны Віцебскай вобласці "Збора помнікаў гісторыі і культуры Беларусі" [6]. Карыснымі будуць кнігі віцебскіх краязнаўцаў і пошукавікоў Л.Н. Бруевай [1], А. Бурдо [2], Д.Р. Газіна [3, 4], А.А. Ганчарова [5], Л.К. Нікіцінай [7], В.Д. Цярэшчанка і іншых.

Інфармацыю пра мемарыяльныя комплексы на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і Віцебскай вобласці, можна адшукаць у анацыраваным бібліяграфічным спісе, падрыхтаваным у Віцебскай абласной бібліятэцы "Память, увековеченная в камне: мемориальные комплексы Беларуси" [8]. Карысным будзе і выданне 2000 года, але не страціўшае актуальнасці "Поисковая работа. История и традиции" [11], а таксама "Маршрутами народной славы" [12].

Лепшым электронным рэсурсам, на якім змяшчаюцца імёны салдат, якія пахаваны ў воінскіх пахаваннях на тэрыторыі Віцебскага раёна, з'яўляецца сайт, падрыхтаваны В.М. Марозавым "Ценою жизни" [12].

Прапануем спіс маршрутаў "зорных" паходаў у наваколлях Віцебска (скарачэнні, якія робяцца ў тэксце: ВП — воінскае пахаванне, сд — стралковая дывізія.)

1. **Акцябарскі** (Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, мемарыяльны знак у гонар 293-га артылерыйскага палка, Алея памяці імя Героя Савецкага Саюза П.В. Шысцерава) – **Шапуры** (Воінскія могілкі (№ 4420, магіла Героя Савецкага Саюза П.В. Шысцерава) – **Сялюты** (помнік у гонар 1-й штурмавой камсамольскай брыгады).

2. **Акцябарскі** – **Шульцава** (помнік на вышыні 222,9, з якой пачыналася вызваленне Віцебска).

3. **Бабінічы** (школьны музей, ВП № 4388 (пахаваны больш 2,5 тысяч савецкіх салдат), ВП № 5716, помнік вучням і настаўнікам, памятны знак на месцы калодзежа, у які фашысты скідвалі закатаваных патрыётаў, шыльда ў гонар Героя Савецкага Саюза У.Ц. Курыленкі, шыльда ў гонар Героя Савецкага Саюза В.Я. Васілеўскага, Сад Перамогі).

4. **Бычыха** (мемарыяльная шыльда у памяць разгрому варожага гарнізону, пахаванне ахвяр вайны) – **Быкі** (помнік Герою Савецкага Саюза І.М. Антонаву, помнік на месцы гібелі Героя Савецкага Саюза М.М. Рудыка).

5. **Вароны** (школьны музей Народны музей воінскай славы, ВП № 4391 (пахавана больш 3,5 тысяч салдат), помнік землякам, помнік савецкім лётчыкам 953-га штурмавога авіяпалка, помнік "віцебскім панфілаўцам") – **Друкава** (месца подзвігу савецкіх воінаў (помнік "Віцебскім панфілаўцам") – **Фалькавічы** (Цудатворны абраз Маці Божай Фалькавіцкай).

6. **Вярхоўе** (помнік на месцы загубы мірных жыхароў, пахаванне ахвяр вайны, музей 1-й Віцебскай партызанскай брыгады ў СШ № 15) – **Трыгубцы** (пахаванні ахвяр вайны) – **Шалыгі** (2 пахаванні ахвяр вайны ў наваколлях вёскі).

7. **Гарадок** (помнік вызвалення, помнік воінам-вызваліцелям, ВП № 4363 (пахаваны больш за 5 тысяч савецкіх воінаў, у тым ліку 4 Героя Савецкага Саюза, помнік генералу І.Х. Баграмяну, танк Іс-2) – **Вераб'іныя горы** (мемарыял спаленым вёскам Гарадоччыны, ВП № 1599, 5813, 6349) – **в. Дуброва/ур. Шчалбоўскі лес** (помнік партызанам "Гаспадар леса").

8. **Замасточча** (ВП № 4397, ВП № 4399, магіла І.А. Самахвалава, мемарыяльная дошка У.А. Канаваленку, помнік Герою Савецкага Саюза М.І. Дружыніну) – **Гаравыя** – **Кузмянцы** (памятны знак 251-й стралковай дывізіі, ВП № 4445) – **Шапечына** (мемарыяльны знак "Лучосе") .

9. **Заронава** (музей "Гісторыя Заронаўскага краю, мемарыял на воінскіх могілках ВП № 4407, мемарыяльны знак ветэранам і загінуўшым жыхарам сельсавета, мемарыяльная дошка ў гонар лётчыкаў 3-й паветранай арміі, мемарыяльная дошка ў памяць пра камандны пункт 43-й арміі) – **Тапорына** – **Варашылы** (памятны знак на месцы гібелі экіпажа самалёта ІЛ-2) – **Пестуніца** (ВП № 4413).

10. **Заполле** (ВП № 4395, помнік "Віцебскія "вароты", мемарыяльная дошка ў гонар аднаўлення савецкай улады, месца базіравання штаба 1-й Беларускай партызанскай брыгады).

11. **Езярышча** (вайсковыя могілкі, помнік – танк Т-70, помнік землякам, помнік партызанам, магілы ахвяр фашызму).

12. **Копцi** (Воінскі мемарыял у гонар Ленінскага камсамола, у складзе мемарыяла больш за 15 помнікаў, ВП № 4462).

13. **Курына** (магіла Героя Савецкага Саюза М. Сільніцкага, ВП № 4418, пахаванне партызанак, магіла партызана Шляхто).

14. **Залучча** – **в. Марыямпаль / в. Баталі** – **воз. Лосвіда** – **ур. Магучова** (ВП № 4431, помнік на месцы неўдалага наступлення савецкай арміі ў студзені 1944 г.) – **Герасімова** (магіла савецкіх разведчыкаў (ВП № 7874) – **Доўжа** – **Шылы** (магіла невядомага савецкага воіна (ВП № 5715).

15. **Чыгуначная станцыя Лосвіда** – **Баранаўка** (магіла ахвяры вайны ВП № 7873) – **Бараўляны** (месца былога нямецкага канцлагера, памятныя крыжы на месцы загубы савецкіх ваенапалонных і мірных жыхароў) – **чыгуначная станцыя Лужасна** (мемарыяльная стэла ў гонар першага сярод камсамольцаў БССР Героя Савецкага Саюза М. Сільніцкага).

16. **Чыгуначная станцыя Лосвіда** (брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан (ВП № 4429).) – **Буяны** – **Храпавічы** (Пахаванне невядомага савецкага воіна (ВП № 7842) ці **Лосвіда** (ВП № 4430) – **ур. Баркова** (памятны знак на месцы спаленай вёскі).

17. **Лужасна** (магіла савецкіх ваенапалонных і ахвяр вайны, памятная шыльда ў гонар вызвалення Лужасна, месца былога канцлагера, музей у аграрным каледжы, у якім частка экспазіцыі прысвечана Вялікай Айчыннай вайне) – **Мазалава** (ВП № 7844, помнік землякам).

18. Паход на плацдарм Навікі. **Дыманова-1** – **Старынцы** – **плацдарм Навікі** (ВП № 8013, памятны знак у гонар савецкіх салдат 735-га самаходна-артылерыйскага палка) – **Сялюты** (помнік у гонар 1-й штурмавой камсамольскай брыгады) – **Шапуры** (воінскія могілкі (ВП № 4420)) – **Акцябарскі** (Віцебскі раённы гісторыка-краязнаўчы музей, мемарыяльны знак у гонар 293-га артылерыйскага палка, Алея памяці імя Героя Савецкага Саюза Пятра Васільевіча Шысцерава).

19. **Ноўка** (ВП № 4433, помнік землякам, мемарыяльная дошка Герою Савецкага Саюза П.Л. Даўбешкіну, памятны знак у гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Алея Славы на Алеі славутых землякоў).

20. **Чыгуначная станцыя Прудок Гарадоцкага раёна** (ВП № 2413, помнік на магіле) – **брацкая магіла партызан на беразе р. Верцея** (ВП № 7837).

21. **Руба** (музей малалетніх вязняў вайны ў СШ, брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан, помнік на пахаванні) – **Койтава** (ВП № 4427, памятны знак на месцы пераходу 825-га волга-татарскага батальёна на бок партызан каля музея-сядзібы "Здраўнёва") – **Чырвоны Двор** (ВП № 4424, пахаванні ахвяр вайны) – **Лужкі** (ВП № 4432, месца базіравання Віцебскіх падпольных райкамаў КП(б)Б і ЛКСМБ, штаба 1-й Віцебскай партызанскай брыгады).

22. **Сасноўка** (месца дзеяння падпольнай арганізацыі, ВП № 4435 – **Валасова** (ВП № 4438) – **Перавоз** (ВП № 4437).

23. **Сасноўка** (месца дзеяння падпольнай арганізацыі, ВП № 4435 – **Валасова** (ВП № 4438) – **Гараднянскі Мох** (ВП № 2298) – **Гарадняны** (магіла ахвяр фашызму (№ 6678) – **Ноўка**.

24. **Сушчова** (ВП № 4426) – **Шчучына** (ВП № 4425, крыніца, пахаванне, магіла генерала (Дамеці?)) – **ур. Шухвасты** (месца спаленай вёскі).

25. **Сушчова** (ВП № 4426) – **ур. Смалякі** (ВП № 5739) – **ур. Баркова** (помнік спаленай вёсцы).

26. **Сушчова** (ВП № 4426) – **Грабяніц**а – **воз. Валконка** (месца сходаў падпольшчыкаў; ВП № 4428).

27. **Шапечына** (мемарыяльны знак "Лучосе") – **Кузьмянцы** (ур. Шаркі – ВП № 4445, памятны знак 251-й стралковай дывізіі) – **Ліпаўцы** (памятны знак у гонар салдат 251-й сд.; брацкая магіла савецкіх воінаў "Зорачка") – **Макарава** (месца прарыву Чырвонай Арміяй варожай абароны ў чэрвені 1944 г) – **Мяклава**.

28. **Міхалкова** (месца загубы савецкіх патрыётаў-падпольшчыкаў) – **Дражня** (ВП № 4416, пахаванні ахвяр вайны) – **ур. Трыніўкі** (пахаванне ахвяр вайны).

29. **Старое Сяло** (ВП № 4421, магіла Героя Савецкага Саюза У.П. Краева, помнік землякам, памятны знак настаўнікам і вучням Старасельскай СШ, якія загінулі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, памятны знак А.П. Калініну, помнік Герою Савецкага Саюза Ф.П. Ерзікаву, помнік Герою Савецкага Саюза В.П. Краеву, памятны знак на месцы подзвігу М.А. Ніканава) – **Пабядзіншчына** (ВП № 5717 "Жураўліная вышыня", помнік па месцы гібелі Героя Савецкага Саюза У.П. Краева, памятная дошка ў гонар Героя Савецкага Саюза Дзмітрыя Міхайлавіча Пярова, Святая крыніца).

30. **Цірaспаль** (ВП №3) – **Суйкава** (брацкая магіла партызанак (ВП № 4408).

31. **Вымна** (школьны музей, ВП № 4451, помнік Герою Савецкага Саюза А.Я. Углоўскаму, пахаванні ахвяр вайны).

32. **Сураж** (ВП № 4439, ВП № 4467, магіла сапёраў, помнік партызанам 1-й Беларускай партызанскай брыгады, месца разгрому варожага гарнізона, помнік дзецям М.П. Шмырова Памятны дуб, пахаванне ахвяр вайны № 7987 на былых яўрэйскіх могілках, Сад Перамогі, Алея Памяці ў гонар 75-годдзя вызвалення Беларусі, мемарыяльная шыльда ў гонар надання Суражскай школе імя М.П. Шмырова).

33. **Янавічы** (ВП № 4446, помнік у гонар вучняў і настаўнікаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, помнік Герою Савецкага Саюза Р.С. Гарфункіну, магіла невядомага савецкага лётчыка (ВП № 5727) – **Сцяпная** (магіла 230 яўрэяў – мясцовых жыхароў).

Яшчэ адной дзейнаснай формай патрыятычнага выхавання моладзі з'яўляюцца паездкі ў наваколлях Віцебска, па прасторы Віцебскай вобласці. Прывядзем некалькі іх актуальных напрамкаў.

1 – "**Вымна–Сураж–Янавічы**". У наваколлях Віцебска ёсць шмат месцаў, якія знаходзяцца не вельмі далёка ад абласнога цэнтра, але дабірацца да іх досыць складана. *Напрыклад*, гарадскі пасёлак Сураж і Янавічы. Гэтыя месцы лепей наведаць, разам арганізаваўшы аўтобусную паездку, пры гэтым заехаць ў аг. Вымна, дзе знаходзіцца цікавы школьны музей і адзін з важнейшых цэнтраў пошукавага руху на Віцебшчыне.

2 – **Полацкі раён. Полацк** (музей баявой славы, мемарыял у гонар вызваліцеляў) – **в. Мацейкіна** (ДОТ на былой "Лініі Сталіна" і ВП) – **Баравуха** (мемарыял "Звязда") – **Гомель** ("Поле ратнай славы").

3 – **Ушацкі раён. Арэхаўна** (помнік землякам, помнік Касцючэнка) – **Ушачы** (музей баявой славы) – **Паперына** (мемарыяльны комплекс "Прарыў") – **Пуцілкавічы** (помнік А.С. Броўка, музей П. Броўка).

4 – **Бешанковіцкі раён. Бешанковічы** (краязнаўчы музей, курган славы, магілы ахвяр фашызму) – **Астроўна** (брацкая магіла савецкіх воінаў, магіла ахвяр фашызму, помнік землякам) – **в. Узрэчча** (месца фарсіравання р. Дзвіна ў час аперацыі "Багратыён", магіла 8 Героеў Савецкага Саюза) – **Хоціна** (радзіма Л. Даватара, помнік Л. Даватару) – **Ула** (вайсковыя могілкі, пахаваны 3 Героя Савецкага Саюза, магіла ахвяр фашызму, помнік землякам, помнік вызваліцелям).

5 – **Лёзненскі раён. Лёзна** (помнік вызваліцелям Т-34, мемарыял "Адаменская горка", магіла ахвяр вайны "Адаменскі роў", помнік землякам) – **Восьпенкі** (Ціхмянаўская вышыня) – **Бабінавічы** (воінскія могілкі) – **Калышкі** (радзіма Я.М. Фаміна – героя абароны Брэсцкай крэпасці) – **Асташэва** (магіла і помнік ахвярам фашызму) – **Крынкі** (помнік Герою Савецкага Саюза М. Акцябарскай, месца гібелі П.А. Галецкага, помнік землякам, школьны музей "Баявой і працоўнай славы", школьны мемарыяльны музей М. Лынькова, месца нараджэння генерал-фельдмаршала І. Гурка) – **Высачаны** (ВП, помнік на брацкіх магілах, помнік вызваліцелям, помнік медыцынскім работнікам і партызанам) – **Пагосцішча** (помнік у памяць боя 1942 г., ВП).

6 – **Сенненскі раён. Багушэўск** (памятны знак у гонар Сенненска-лепельскага контрудара 6–10.07. 1941 г., помнік савецкім воінам і партызанам, памятная шыльда на будынку вакзала ў гонар лётчыка У.М. Гарбунова, загінуў у 1944 г., помнік А. Гараўцу ("Крыло бессмяротнасці"), памятны знак ва ўшанаванне растраляных яўрэяў і славян) – **Сянно** (помнік "Лепельскаму контрудару", брацкія магілы савецкіх воінаў і партызан, танк ІС-3) – **ур. Купаваць** (брацкія магілы савецкіх воінаў і партызан, месца гібелі Героя Савецкага Саюза К. Заслонава) – **Машканы** (радзіма Героя Савецкага Саюза А.К. Гараўца; помнік Герою Савецкага Саюза І.Л. Камінскаму) – **Шыркі** (мемарыяльны знак на месцы дома, дзе нарадзіўся П.М. Машэраў).

7 – **Шумілінскі раён. Шуміліна** (краязнаўчы музей, помнік вызваліцелям, радзіма Героя Савецкага Саюза П. Акуцыёнка) – **Обаль** (музей "Патрыёты Обальшчыны", помнік у гонар обальскага камсамольскага падполля "Юныя мсціўцы", ВП) – **Мішневічы** (воінскія могілкі, помнік землякам, САУ-152) – **Тропіна** (мемарыял на воінскіх магілках, магілы 4 Герояў Савецкага Саюза) – **Нікалаёва** (помнік землякам) – **Ула** (вайсковыя могілкі, пахаваны 3 Героя Савецкага Саюза, магіла ахвяр фашызму, помнік землякам, помнік вызваліце-

лям).

8 — **Аршанскі раён. Орша** (мемарыяльны комплекс “Кацюша”, помнік К.С. Заслонаву, мемарыял у гонар вызваліцеляў, музей гісторыі і культуры Аршаншчыны) — **Арэхаўск** (магіла Героя Савецкага Союза Ю. Смірнова) — **Буда** (каля дарогі М-1 помнік падпольшчыкам Асінторфа) — **мемарыяльны комплекс “Рыленкі”**.

Такім чынам, патрыятычнае выхаванне моладзі — адна з актуальных праблем сучаснай адукацыйнай прасторы, і найбольш дзейнасныя формы такой работы — турыстычныя паходы, экскурсіі, паездкі па наваколлях Віцебска, прасторы Віцебскай вобласці.

**Спіс літаратуры**

1. Бруева, Л.Н. Пока не похоронен последний павший солдат...: из ист. поискового движения в Витеб. обл. / Л.Н. Бруева. — Орша: Оршан. тип., 2009. — 496 с.
2. Бурдо, А. Не предай забвению! Малоизвестные страницы войны (из опыта поисковой работы) / А. Бурдо. — Витебск: Диджитал-Экспресс, 2008. — 90 с.
3. Газин, Д.Р. Лужеснянские страницы / Д.Р. Газин. — Витебск: Витебская областная библиотека, 2002. — 94 с.
4. Газин, Д.Р. Пылал Придвинский край: Рассказы о войне / Д.Р. Газин. — Витебск: ВОТ, 2005. — 144 с.
5. Гончаров, А.А. Первая Витебская партизанская бригада (1941–1943 гг.) / А. Гончаров. — Витебск: Витебская областная типография, 2012. — 321 с.
6. Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / АН БССР; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; рэд. кал.: С.В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн.: БелЭн, 1985. — 496 с.
7. Вспомним всех поименно / О.В. Молодечкин [сост.]. — Новополоцк: О.В. Молодечкин, 2009. — 132 с.
8. Память, увековеченная в камне: мемориальные комплексы Беларуси: к Международному дню памяти жертв фашизма: аннотированный библиографический список / ГУ «Витебская областная библиотека имени В.И. Ленина», Е.Л. Скрипник [сост.]. — Витебск, 2014. — 50 с.
9. Півавар, М.В. Звод помнікаў воінскай славы, памятных месцаў, воінскіх пахаванняў і пахаванняў ахвяр Вялікай Айчыннай вайны Віцебскага раёна / М.В. Півавар [склад.]. — Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2021. — 134 с.
10. Шелухо, В.Д. Поисковая работа. История и традиции: пособие для учителей, кл. рук-лей, работников внешк. Учреждений / В.Д. Шелухо. — Минск: НМЦентр, 2000. — 120 с.
11. Шомоди, В.Э. Маршрутами народной славы / В.Э. Шомоди. — Минск: Полымя, 1988. — 350 с.
12. Ценою жизни [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://pomnim.vymno.of.by. — Дата доступа: 12.02.2022.

*Дата поступления в редакцию: 03.03.2022*

# ОБ ОТДЕЛЬНЫХ ВОПРОСАХ МЕТОДИЧЕСКОГО СОПРОВОЖДЕНИЯ ВОСПИТАТЕЛЬНОЙ РАБОТЫ В УЧРЕЖДЕНИИ ОБРАЗОВАНИЯ

*Левкович Татьяна Мечеславовна*

***Аннотация.*** *Публикация посвящена актуальным вопросам методического сопровождения воспитательной работы в учреждении образования, направленной на формирование свободной, духовной, творческой личности гражданина. Становление этих качеств у учащихся происходит в ходе реализации основных направлений воспитательной работы в школе — духовно-нравственного воспитания; художественно-эстетического воспитания; гражданско-патриотического воспитания; экологического воспитания; правового воспитания; воспитания здорового образа жизни.*

Воспитательная работа в школе сложна и многообразна. Она представлена такими взаимосвязанными компонентами, как воспитание в процессе обучения, воспитание в обществе и коллективе, семье и школе, самовоспитание и перевоспитание, воспитательная работа в процессе труда, игры, общения, общественной деятельности, самодеятельности, творчества и самоуправления [1]. Система воспитания в учреждении образования ориентирована на реализацию главной цели – на основе овладения общечеловеческими ценностями сформировать свободную, духовную, творческую личность гражданина, патриота, семьянина, труженика.

Для того, чтобы выстроить и систематизировать работу педагогов, нами разработана матричная модель воспитательной работы учреждения образования, в которой определены три ключевых направления: в младшей школе при сохранении всех направлений воспитательной работы приоритетным является духовно-нравственное воспитание, при переходе в среднюю школу реализуются все направления, и, наряду с духовно-нравственным воспитанием, среди приоритетных выступает экологическое воспитание. В старшем звене, сохраняя все направления и поддерживая сложившиеся в школе за десять лет традиции, особое внимание уделяется правовому воспитанию, которое реализуется в тесном сотрудничестве с Академией МВД Республики Беларусь.

**I ступень. Духовно-нравственное воспитание.**

Главной целью работы с учащимися младшего